УДК 81'282.2 (476.7)

# НАРОДНЫЯ ГАВОРКІ ВЕРХНЯГА НАД'ЯСЕЛЬДЗЯ

***А.А. БОСАК\ В.М. БОСАЮ***

*'Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларуст, bosakalena@tut.by*
*[2]Палескі дзяржаўны універсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь, bosakl@tut.by*

## УВОДЗІНЫ

Пры вывучэнні тэрытарыяльнага вар'іравання сістэмы мовы ў Беларусі перш за ўсё вылучаецца ўся асноўная яе тэрыторыя, асноўны масіў беларускай дыялектнай мовы, які супрацьстаўляецца яе невялікай паўднёва-заходняй частцы - заходнепалескай групе гаворак [1—4].

У складзе беларускай мовы заходнепалескія гаворкі з'яўляюцца структурнай агульнасцю па шэрагу сваіх асаблівасцей і сродкаў і, адпаведна, адносна невялікай і цэласнай тэрытарыяльнай групай. Разам з гэтым па многіх сваіх асаблівасцях яны характарызуюцца значнай неаднастайнасцю. Выразнай адметнасцю тэрытарыяльнага пашырэння структурных разнавіднасцей заходнепалескіх гаворак з'яўляецца стракатасць іх узаемнага тэрытарыяльнага размяшчэння. Заходнепалескі дыялектны ландшафт з'яўляецца спалучэннем розных па канфігурацыі і велічыні тэрытарыяльных частак гаворак заходнепалескіх структурных разнавіднасцей [4, с. 201].

Прадметам нашага даследавання з'яўляюццагаворкі Верхняга Над'ясельдзя. Гэта тэрыторыя Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і яго сумежжа. Размешчаны рэгіён у паўночна-заходняй частцы Брэсцкай вобласці. Яго асноўнай воднай артэрыяй з'яўляецца левы прыток Прыпяці - рака Ясельда ў яе верхнім цячэнні. Пачынаецца яна на Пружаншчыне, упадае ў Прыпяць на ўсход ад г. Пінска.

Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя цікавыя тым, што яны знаходзяцца на стыку Беларускага Панямоння і тыповага Заходняга Палесся ў зоне моўных міждыялектных кантактаў і дыялектных узаемаўплываў. Сумежныя гаворкі адрозніваюцца разнастайнасцю мясцовых асаблівасцей, даследаванне якіх мае важнае значэнне для гісторыі і развіцця беларускай мовы [2, 4—7].

## МЕТОДЫКА І АБ'ЕКТЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Даследаванне асноўных фанетычных, марфалагічных і лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над'ясельдзя аўтарамі праводзілася на тэрыторыі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці (асноўная частка даследаванняў) і на сумежнай тэрыторыі Бярозаўскага, Івацэвіцкага, Камянецкага, Кобрынскага раёнаў Брэсцкай вобласці, Ваўкавыскага, Зэльвенскага, Свіслацкага і Слонімскага раёнаў Гродзенскай вобласці. Усяго абследаваны гаворкі жыхароў 231 населенага пункта, з іх у Пружанскім раёне - 214, Бярозаўскім - 6, Свіслацкім- 5, Ваўкавыскім- 1, Зэльвенскім- 1, Івацэвіцкім- 1, Камянецкім 1, Кобрынскім- 1, Слонімскім раёне - 1 населены пункт.

Апытванне праводзілася па спецыяльна распрацаванай праграме, якая ўключала пытанні па фанетыцы, марфалогіі і лексіцы (Як у вас гавораць? Як у вас называюць?).

Поўная праграма даследавання ўключала 40 пытанняў па фанетыцы і 40 пытанняў па марфалогіі, а таксама 102 пытанні па лексіцы. Па поўнай праграме абследавана 118 населеных пунктаў. Па кароткай праграме (15 пытанняў па фанетыцы і марфалогіі абследавана 113 населеных пунктаў Верхняга Над'ясельдзя.

Па выніках праведзеных даследаванняў складзена 204 карты, у тым ліку фанетычныя - 30, марфалагічныя - 40, лексічныя - 90, ізаглосныя - 35, гістарычныя — 5, агульныя - 4. Фанетычныя і марфалагічныя карты апублікаваны ў «Атласе гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Фанетыка і марфалогія» (Мн., 2005), лексічныя і гістарычныя — у «Атласе гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Лексіка» (Мн., 2006), фанетычныя, марфалагічныя, лексічныя, ізаглосныя і гістарычныя - у дысертацыйнай рабоце «Дыферэнцыяцыя і арэальныя сувязі гаворак Верхняга Над'ясельдзя» (Мн., 2006), асноўныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя карты апублікаваны ў манаграфіі «Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя» (Мн., 2007) [8-11].

ПолесГУ

## ВЫНІКІІІХ АБМЕРКАВАННЕ

Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя маюць шэраг агульных фанетычных, марфалагічных і лексічных з'яў якія аб'ядноўваюць іх паміж сабой. Так, для ўсіх гаворак характэрны: захаванасць этымалагічнага ***а** *{трава, браток, замок*); захаванасць этымалагічнага *о ў канцавых адкрытых складах (*дз'адз'ко /д'ад'ко/, бац'ко / бат'ко/);* захаванасць этымалагічнага *у *{суп, кусок, капуста)',* захаванасць этымалагічнага ***ы** *{сын, дым, высоко)',* мяккасць **[л|** перад этымалагічнымі ***е, *і** *{л'іпа, пдл'е);* ацвярдзенне этымалагічнага ***р** *(рэчка, грэх, рэзаг/'*); ацвярдзенне зычных **[ж], [ч], [ш]** *{шапка, жаба)',* націскны канчатак **-ая** ў прыметнікаў жаночагароду ў назоўным склоне *(маладая /молодая/, старая)',* лексемы *шуляк* 'каршун'; *шчур* 'пацук'; *калёйка /копейка, комика, кулика/* 'гурт вясковых кароў'; *ясёнка Псёнка/* 'асенняе паліто'; *плот /плут/* 'агароджа'; *драбіна / драбі^ы^на, драбына/; зацішак /зацішок, затыиюк/* 'захіленае ад ветру месца'.

У той жа час народныя гаворкі Верхняга Над'ясельдзя маюць значныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя адрозненні. Гаворкі падзяляюцца шматлікімі фанетычнымі, марфалагічнымі і лексічнымі ізаглосамі, аб'яднанымі ў 20 пучкоў ізаглос: 1) панямонскі; 2) ружанска-шарашоўскі; 3) ружанска-пружанскі; 4) свіслацка-шарашоўскі; 5) свіслацка-пружанскі; 6) малецкі; 7) загародска-малецкі; 8) загародскі; 9) міжзагародскі; 10) лыскаўска-варанілавіцкі; 11) байкоўскі; 12) калазубаўскі; 13) вялікасельскі; 14) старавольскі; 15) шарашоўскі; 16) шанёўскі; 17) гараднянскі; 18) смаляніцкі; 19) ліноўскі; 20) вінецкі. Найбольшую колькасць ізаглос уключаюць пучкі панямонскі (59 ізаглос) і загародскі (50 ізаглос), найменшую - пучкі вінецкі (6 ізаглос), вялікасельскі (6 ізаглос), старавольскі (7 ізаглос), калазубаўскі (7 ізаглос), загародска-малецкі (8 ізаглос) і шанёўскі (9 ізаглос).

Па выніках праведзеных даследаванняў на тэрыторыі Верхняга Над'ясельдзя выдзелены наступныя групы гаворак: гаворкі гродзенска-баранавіцкія - на поўначы (уключаюць лыскаўскую і варанілавіцкую падгрупы), паўночнабрэсцкія акаючыя - на захадзе (уключаюць роўбіцкую і вялікасельскую падгрупы), паўночнабрэсцкія окаючыя - у цэнтры (уключаюць шанёўскую і шарашоўска-гараднянскую падгрупы), верхняясельдскія - у цэнтры, на ўсходзе і паўднёвым усходзе (уключаюць рудніцкую, смаляніцкую і ліноўскую падгрупы), малецкія - на паўднёвым усходзе, паўночназагародскія - на паўднёвым захадзе, сярэднезагародскія - на поўдні рэгіёна (малюнак).

**Гродзенска-баранавіцкім гаворкам** на тэрыторыі Верхняга Над'ясельдзя характэрны: шасціфанемны склад галосных - [і], [ы], [е], [а], [о], [у]; паслядоўнае аканне *(галава, малакд, кардва);* мяккасць губных і пярэднеязычных перад рэфлексамі ***е, *і** *{бёраг, пясбк, зямля, сіла, зіма, вішня);* мяккасць заднеязычных у былых спалучэннях ***гы, *кы, *хы** *{дарагі, кардткі)',* на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам вымаўляецца [о] *{стог, конь, воз)',* на месцы ***Т>** *(яцъ)* пад націскам вымаўляецца [е] *{сёно, лес, лёто):* паслядоўнае цеканне-дзеканне *{дзень, ідзё, дзед, людзі, дзялка, сядзь, цяплд, ціхо, ценъ, цяжко, пяцъ);* займеннікі 3-й асобы *ён, яна, янд, яны',* формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксам **-ць** *(умываць, купаць, спаць*); формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам **-ца** *{умывацца, купсица*); формы зваротных дзеясловаў у першай асобе адзіночнага ліку цяперашняга часу і зваротных дзеясловаў у прошлым часе з постфіксам **-ся** /-сё/ *(умываюся, купаюся /умываюсё, купаюсё/; умыўся, купаўся /умыўсё, купаўсё/);* лексемы *кастрыца* 'сасновая ігліца', *чаббр* 'чабор', *сіняк* 'махавік', *папрўга* 'скураны пасак', *столь* 'столь', *качарга* 'качарга', *ржышчо* 'іржышча', *картдплі* 'бульба*гумнд* 'гумно'.

Гаворкам варанілавіцкай падгрупы характэрны пратэтычны **[в|** *(едка, вдзера);* вымаўленне галоснага **[і]** на месцы *е ў першым пераднаціскным складзе пасля ***н** *{німа, ні знаю);* ненаціскны канчатак -а ў прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(нова, добра)',* націскны канчатак -ое ў прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(маладде, старое)',* лексемы *абшлагі* 'манжэты', *наліванка* 'крывяная каўбаса', *камяк* 'таўчоная бульба /пюрэ/', *дрыгва* 'халадзец'; лыскаўскай падгрупе ўласціва адсутнасць пратэтычнага **[в]** *(око, озеро);* вымаўленне галоснага **[еј** на месцы *е ў першым пераднаціскным складзе перад ***н** *(нема, не знаю);* ненаціскны канчатак **-ая** ў прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(новая, добрая)',* націскны канчатак **-оё** ў прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(маладдё, старое)',* лексемы *абшэўкі /ашэўкі/* 'манжэты', *кішка* 'крывяная каўбаса', *каша* 'таўчоная бульба / пюрэ/', *квашаніна /квашаніна/* 'халадзец'.

ПолесГУ




Мал. Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя

**Паўночнабрэсцкім акаючым** гаворкам на тэрыторыі Пружанскага раёна характэрна паслядоўнае аканне *(галава, малакд, кардва);* прыстаўны гук [г] *(гараці, ганўча);* ненаціскны канчатак -ае ў прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне (*ндвае, бёлае),* ненаціскны канчатак **-ым** у прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў месным склоне *(у новым, у белым),* лексемы *шчыпёр* 'лісце цыбулі', *лгун* 'манюка', *пдгрэб* 'капец бульбы', *кардбка* 'прыстасаванне для сяўбы' і г. д.; **паўночнабрэсцкім окаючым** - паслядоўнае оканне (*голова, молоко, корова),* адпаведна адсутнасць прыстаўнога **[г] (***ораці, онуча);* ненаціскны канчатак **-эе** ў прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне (*ндвэе, бёлэе),* ненаціскны канчатак **-ом** у прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў месным склоне *(у новом, у белом);* лексемы *цыбўля* 'лісце цыбулі', *муцяр* 'манюка', *скопэц* 'капец бульбы', *сэвэнька* 'прыстасаванне для сяўбы'.

Да агульных асаблівасцей паўночнабрэсцкіх гаворак адносяцца: шасціфанемны склад галосных - [і], [ы], [е], [а], [о], [у]; паслядоўнае цеканне-дзеканне *(дзет, ідзё, дзед, людзі, дзялка, сядзь, цеплд, ціхо, цень, цяжко, п 'яць);* мяккасць пярэднеязычных перад рэфлексамі ***е, *і (***зя'мля /земля/, село, сіла, зіма);* мяккасць губных перад рэфлексамі *і (*вішня, піла, міска);* цвёрдасць губных (у болыпасці гаворак) перад рэфлексамі *е *(пасок, машдк, васна* - паўночнабрэсцкія акаючыя (роўбіцкая падгрупа), *пэсбк, мэшбк, вэсна* - паўночнабрэсцкія окаючыя (шанёўская падгрупа)); мяккасць заднеязычных у былых спалучэннях ***гы, *кы, *хы** *(дарагі ІдорогіІ, кардткі /кордткі/);* на месцы *о ў новых закрытых складах пад націскам вымаўляецца [о] *(стог, конь, воз);* на месцы ***Ъ** пад націскам вымаўляецца [е] *(сёно, лес, лёто);* пратэтычны **[в]** у займенніках 3-й асобы *(вон, вона / вана/, вонд /ванб/, воны ІваныІ);* формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксам **-ці** *(умываці, купаці, спаці);* «саканне» *(умываціса, купаціса; умываюса, купаюса; умыўса, купаўса);* лексемы *беліці Ібэліці/* 'мыць бялізну', *кацюба* 'качарга', *памдст ІпомдстІ* 'падлога', *шыката ІшыкотаІ* 'сасновая ігліца'.

**У** вялікасельскай **і** шарашоўска-гараднянскай падгрупах губныя перад рэфлексамі ***е** мяккія *(песок, мешок, ведро);* у роўбіцкай і шанёўскай падгрупах - цвёрдыя *(пасок, машдк, вадрд; пэсбк, мэшбк, вэдрд).*

**Верхнясельдскім гаворкам** характэрны наступныя рысы: васьміфанемны склад галосных - [і], [ы], [е], [а], [о], [у], [іе], [уо]; паслядоўнае оканне *(молоко, голова, корова);* перад рэфлексамі *е пярэднеязычныя (акрамя *л)* і губныя вымаўляюцца цвёрда *(зэмля, сэлб, дэнь, пэсбк, мэшбк, нэбо);* перад рэфлексамі *і пярэднеязычныя І губныя вымаўляюцца мякка *(зіма, сіла, піла, вішня, міска);* мяккасць заднеязычных у былых спалучэннях ***гы, *кы, *хы** *(дорогі, корбткі);* на месцы ***Ъ** пад націскам вымаўляецца дыфтонг [іе] *(сіено, ліес, ліето);* на месцы *о ў новых закрытых складах пад націскам вымаўляецца дыфтонг [уо] *(стуог, куонь,*

ПолесГУ

*вуон, вуоз*); пратэтычны **[в]** у займенніках 3-й асобы (*вуон, вона, вонд, воны*); формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксам **-ці (***умываці, купаці, спаці*); "саканне" *(умываціса, купаціса; умываюса, купаюса; умыўса, купаўса);* лексемы *бодкі Iбддэха/* 'сасновая ігліца', *бўльва* 'бульба', *бэрэзняк* 'падбярозавік', *пэдэрко* 'божая кароўка',*маты'лка* 'матылёк', *пдразок* 'пасак з тканіны', *кішка* 'крывяная каўбаса', *тоўканіца* 'таўчоная бульба', *кдпашка* 'невялікая рыдлёўка'.

У ліноўскай падгрупе на месцы *д' **(d')** і ***;r(d')** вымаўляецца [д] цвёрды перад *е (*дэнь, дэрэво, ідэ, дэ, нідэ, нёдэ),* [дз'] мяккі - у іншых пазіцыях (*дзед, ходзіці, людзі).* У рудніцкай падгрупе, у адрозненне ад ліноўскай, у некаторых словах перад *е вымаўляецца [дз'] мяккі *(дзе, нідзё, нёдзі).* У смаляніцкай падгрупе на месцы *д' **(d')** і *;r**(d')** вымаўляецца [д] цвёрды перад *е *(дэнь, дэрэво, ідэ),* у некаторых словах - [дз'] мяккі *(дзе, нідзё, нёдзі).* У іншых пазіцыях у гэтай падгрупе на месцы *д' **(d')** і *.r**(d')** вымаўляецца [д^3'] мяккі *(д'ед, ход'гці, люд'і).* Смаляніцкай і рудніцкай падгрупам характэрны лексемы *багнбвік* 'махавік', *покдт* 'гарышча', *кўтаці* 'мыць бялізну', *пэлена* 'падол*ушаток* 'дзежка для жывёлы' і г.д. Ліноўскай падгрупе адпавядаюць лексемы *мшар* 'махавік', *гора* 'гарышча', *мы'ці* 'мыць бялізну', *подблок* 'падол', *бэлец* 'дзежка для жывёлы'.

**Малецкім гаворкам** характэрны: васьміфанемны склад галосных - [і], [ы], [е], [а], [о], [у], [іе], [уо]; паслядоўнае оканне (*.молоко, голова, корова)-,* перад рэфлексамі ***е, *і** зычныя *б,в,м,п,д,т, з, с, н* вымаўляюцца цвёрда *(бэда, вэсна, мэшбк, пэсбк, дэнь, тэплд, зыма, сыла, ныва);* на месцы ***Ъ** пад націскам вымаўляецца дыфтонг [іе] (*сіено, ліес, ліето);* на месцы *о ў новых закрытых складах пад націскам вымаўляецца дыфтонг [уо] (*стуог, куонь, вуон, вуоз);* пратэтычны **[в]** у займенніках 3-й асобы *(вуон, вона, вонд, воны);* формы інфінітыва з асновай на галосны з фанетычным варыянтам суфікса *-ці* **-ты** *(умываты, купаты, спаты);* «саканне» *(умыватыса, купатыса; умываюса, купаюса; умыўса, купаўса);* лексемы *пёр 'е* 'лісце цыбулі', *губка* 'сыраежка', *бэлец* 'дзежка для жывёлы', *якмань* 'толькі што', *журахліны* 'журавіны', *красноголдвэц* 'падасінавік', *повал* 'столь', *гак* 'матыка'.

**Паўночназагародскім гаворкам** характэрны наступныя рысы: шасціфанемны склад галосных - [і], [ы], [е], [а], [о], [у]; «оканне» *(молоко, голова, корова);* перад рэфлексамі *е, *і зычныя *б, в, м, п, д, т, з, с, н* вымаўляюцца цвёрда *(бэда, высна, мышбк, пысдк, дэнь, тэплд, зыма, сыла, ныва);* цвёрдасць заднеязычных у былых спалучэннях ***гы, *кы, *хы** *(дорогы, кордткы);* на месцы ***Ђ»** пад націскам вымаўляецца [і] *(сто, ліс, літо);* на месцы *о ў новых закрытых складах пад націскам вымаўляецца [у] *(стуг, кунь, вун, вуз);* пратэтычны **[в|** у займенніках 3-й асобы *(вун, вона, вонд, воны);* формы інфінітыва з асновай на галосны з фанетычным варыянтам суфікса *-ці* **-ты** *(умываты, купаты, спаты);* «саканне» адсутнічае *(умыватыся, купатыся; умываюся, купаюся; умывся, купався);* лексемы *картдплі* 'бульба', *шчавўх* 'шчаўе', *пухлай* 'падбярозавік', *багнюк* 'махавік', *пырыпы'лка* 'матылёк', *комиⁿрцы* 'манжэты', *бэлітися* 'мыць бялізну', *крупэня* 'крывяная каўбаса', *вышкы'* 'гарышча', *мутюн* 'манюка', *клюня* 'гумно', *краснюк* 'падасінавік', *запул* 'падол', *хвўйка* 'сасна'.

**Сярэднезагародскім гаворкам** характэрны наступныя рысы: шасціфанемны склад галосных - [і], [ы], [е], [а], [о], [у]; «оканне» / у гаворках некаторых населеных пунктаў «уканне» / *(молоко, голова, курдва, увэс);* перад рэфлексамі *е, *і зычныя *б, в, м, п, д, т, з, с, н* вымаўляюцца цвёрда *(бэда, высна, мышдк, пысдк, дэнь, тэплд, зыма, сыла, ныва);* цвёрдасць заднеязычных у былых спалучэннях ***гы, *кы, *хы** *(дорогы, кордткы);* на месцы ***Ъ** пад націскам вымаўляецца [і] *(сіно, ліс, літо);* на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам вымаўляецца [і, ы] *(стыг, кінь, він, віз);* пратэтычны |**в**| у займенніках 3-й асобы *(він, вона, вонд, воны Івуна, вунд, вуныГ);* формы інфінітыва з асновай на галосны з фанетычным варыянтам суфікса *-ці* **-ты** *(умываты, купаты, спаты);* «саканне» адсутнічае *(умыватыся, купатыся; умываюся, купаюся;умывся, купався);* лексемы *картдплі* 'бульба', *шчавўх* 'шчаўе', *пухлай* 'падбярозавік', *багнюк* 'махавік', *пырыпылка* 'матылёк', *комніᵘрцы* 'манжэты', *крупэня* 'крывяная каўбаса', *вышкы'* 'гарышча', *мутюн* 'манюка', *клюня* 'гумно', *бэлітыся* 'мыць бялізну', *краснюк* 'падасінавік', *запіл* 'падол', *хвійка* 'сасна'.

## ВЫВАДЫ

У выніку праведзеных даследаванняў на тэрыторыі Верхняга Над'ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) выдзелены наступныя групы народных гаворак: гродзенска-баранавіцкія - на поўначы, паўночнабрэсцкія акаючыя - на захадзе, паўночнабрэсцкія окаючыя - у цэнтры, верхняясельдскія - у цэнтры, на ўсходзе і на паўднёвым усходзе, малецкія - на паўднёвым усходзе, паўночназагародскія - на паўднёвым захадзе, сярэднезагародскія - на поўдні даследуемага рэгіёна.

Нарастание адрозненняў паміж гродзенска-баранавіцкімі, паўночнабрэсцкімі, сярэднебрэсцкімі і загародскімі гаворкамі мае «ступеньчаты» характар пераходнасці.

Значная дыялектная стракатасць Верхняга Над'ясельдзя з'яўляецца вынікам працяглых актыўных міждыялектных кантактаў, адасобленасцю асобных масіваў густа населеных мікрарэгіёнаў, міграцыйнымі і мікраміграцыйнымі працэсамі.

ПолесГУ

**ЛІТАРАТУРА**

1. Клімчук, Ф.Д. Заходнепалескія гаворкі / Ф.Д. Клімчук // Беларуская мова. Энцыклапедыя. - Мінск: БелЭ, 1994. - С. 218-219.
2. Клімчук, Ф.Д. Гаворкі Заходняга Палесся. Фанетычны нарыс / Ф.Д. Клімчук. - Мінск: Навука і тэхніка, 1983. - 127 с.
3. Крывіцкі, А.А. Асноўны масіў беларускіх гаворак / А.А. Крывіцкі // Беларуская мова. Энцыклапедыя. - Мінск: БелЭ, 1994. - С. 54-58.
4. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі. - Мінск: Вышэйшая школа, 2003. - 294 с.
5. Атлас украі'нськоі' мови. Волинь, Наддністряніційна, Закарпаття і суміжні землі. - Кшв: Навукова думка, 1988. - Т.2.-518 с.
6. Леванцэвіч, Л.В. Лінгвагеаграфічная групоўка гаворак Бярозаўскага раёна: дыс. ... канд. філ. навук: 10.02.01 / Л.В. Леванцэвіч; Інстытут мовазнаўства АН Беларусі. - Мінск, 1996. - 291 с.
7. Atlas gwar wschodnioslowianskich Bialostocczyzny. - Wroclaw, Warszawa. - 1980-1999.
8. Босак, А.А. Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Фанетыка і марфалогія / А.А. Босак, В.М. Босак. - Мінск: ІВЦ Мінфіна, 2005. 94 с.
9. Босак, А.А. Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Лексіка / А.А. Босак, В.М. Босак. - Мінск, 2006. - 124 с.
10. Босак, А.А. Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя: манаграфія / А.А. Босак, В.М. Босак. - Мінск, 2007. 134 с.
11. Босак, А.А. Дыферэнцыяцыя і арэальныя сувязі гаворак Верхняга Над'ясельдзя: дыс. ... канд. філ. навук: 10.02.01 / А.А. Босак; Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. - Мінск, 2006. - 257 с.

## SUBDIALECTS OF VERKHNYAE NADYASELDZE

***A.A. BOSAK, V.M. BOSAK***

***Summary***

Verkhnyae Nadyaseldze is located on the border of Brest-Pinsk Palessie and Panyamonne. Neighboring dialects in this region of Belarus have important speech differences. As a result of the conducted research carried out in Verkhnyae Nadyaseldze district the following basic types of dialects have been revealed: grodzenska-baranavitskaya - in the north, paunochnabrestskaya akayuchaya - in the west, paunochnabrestskaya okayuchaya - in the centre, verkhnyayaseldskaya - in the centre, in the east and southeast, maletskaya - in the southeast, paunochnazagarodskaya - in the southwest, syarednezagarodskaya - in the south of the region researched.

*Паступіў у рэдакцыю 15 лютага 2008 г.*

Полесгу